

Нацыянальная зборная на «Мінск-Арэне» праводзіць паядынкі з камандай Швецыі ў межах Еўрапейскага хакейнага выкліку. Учора галоўны трэнер нашай каманды Кары Хейкіля адказаў на пытанні журналістаў. СТАР 2



Міністэрства адукацыі вызначылася з датамі правядзення ў школах краіны выпускных экзаменаў за курс базавай і сярэдняй школы, выпускных вечароў, а таксама з графікам правядзення экзаменаў у гімназіі і ліцэі. СТАР 6



У Мінску прайшоў дэбютны чэмпіянат па хуткасным паяданні сандвічаў. На вачах у сына, іншых удзельнікаў, журналістаў і проста звычайных прахожых чэмпіён справіўся з 1,5-кілаграмовым бутэрбродам за 20 хвілін. СТАР 8


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 КРАСАВІКА 2012 г. АЎТОРАК № 69 (27184) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## ГЕНПРАКУРАТУРА СУМЕСНА З КДБ АКТЫВІЗУЕ БАРАЦЬБУ З КАНТРАБАНДНЫМ ВЫВАЗАМ КАЛІЙНЫХ УГНАЕННЯЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 красавіка прыняў з дакладам генеральнага пракурора Аляксандра Канюка. Кіраўніка дзяржавы цікавіў стан крымінагеннай сітуацыі ў краіне, ход фарміравання Следчага камітэта.**

Як далажыў генпракурор, па выніках першага квартала гэтага года зменшылася колькасць зарэгістраваных злачынстваў, у тым ліку цяжкіх і асабліва цяжкіх. Знізілася гібель людзей як ад злачынных замахаў, так і ад дзеянняў тэхнагеннага характару. Прэзідэнту таксама было далажана аб шэрагу крымінальных спраў. У бліжэйшы час Генпракуратура сумесна з Камітэтам дзяржаўнай бяспекі і іншымі праваахоўнымі органамі актывізуюць работу па барацьбе з кантрабандным вывазам за межы Беларусі калійных угнаенняў. У гэтым пытанні, канстатаваў Аляксандр Канюк, ёсць недапрацоўкі і ў прававой сферы. Акрамя таго, цяпер вядзецца падрыхтоўка да нарады з удзелам кіраўніка дзяржавы, на якой будуць разгледжаны асноўныя пытанні дзейнасці органаў пракуратуры.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДЗЯКАВАЎ ПАСЛУ МАЛЬТЫЙСКАГА ОРДЭНА ЗА РАЗВІЦЦЁ СУПРАЦОЎНІЦТВА З БЕЛАРУССЮ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 9 красавіка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Суверэннага ваеннага Мальтыйскага ордэна ў Рэспубліцы Беларусь Паўлем Фрыдрыхам фон Фурхерам у сувязі з завяршэннем яго дыпламатычнай місіі ў нашай краіне.**

Фота БЕЛТА.



Аляксандр Лукашэнка падзякаваў паслу за яго работу: «Вы пакінулі ў Беларусі прыемны і значны след ад сваёй дзейнасці. У адрозненне, шчыра скажам, ад сваіх калег, заходніх паслоў, вы той чалавек, які імкнуўся ўсяляк дапамагчы Беларусі, атрымлівалася, не атрымлівалася, заўсёды ўнікаў у праблему і рабіў усё на карысць беларускага народа, за што я вам вельмі ўдзячны».

«Ваша місія тут была накіравана толькі на ўмацаванне дружбы паміж Беларуссю і Мальтыйскім ордэнам. Прапрацаваўшы тут восем гадоў, вы заклалі аснову добрых узаемаадносін паміж намі», — дадаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён выказаў упэўненасць, што новы пасол Мальтыйскага ордэна будзе прытрымлівацца тых жа прынцыпаў.

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў удзячнасць дыпламату за ажыццяўленне ў Беларусі чарнобыльскіх праграм, за дапамогу, перш за ўсё, дзецям, а таксама за праекты ў галіне аховы здароўя і культуры. «Ды і ў палітычных пытаннях не было тэм, у якія вы не ўнікалі б, калі яны адносіліся да вашай кампетэнцыі. І нават калі як чалавек вы бачылі, што можаце ў чымсьці дапамагчы, вы гэта рабілі. Гэта дарагога каштуе, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы хацелі б, каб у нас усе заходнія паслы працавалі менавіта ў гэтым ключы, наладжваючы добрыя адносіны з Беларуссю».

«Вядома, скажу шчыра, мы разлічвалі на большае ў супрацоўніцтве з каталіцкай царквой. Мы лічым, што каталіцкая царква можа зрабіць больш у наладжванні адносін паміж Беларуссю і Заходняй Еўропай, я нават не гавару ў цэлым аб Еўрапейскім саюзе, таму што вядома, хто там першую скрыпку іграе, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму нам хацелася б праз вас данесці гэты сігнал». Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, звяртаючыся да пасла: «У вас сур'ёзны ўплыў у Святым прастоле, у вас там ёсць шмат уплывовых людзей, якія павінны нарэшце паглядзець, што ж адбываецца ў адносінах з краінай, дзе другая па велічыні на постсавецкай прасторы канфесія каталіцкая і дзе добрыя людзі, якія хочуць жыць у дружбе і ўзаемаразуменні».

У сваю чаргу Паўль Фрыдрых фон Фурхер адзначыў, што ў яго склаліся вельмі добрыя адносіны да беларускага народа. «Пункт гледжання нашага ўрада заключаецца ў тым, што дыялог, размова заўсёды дапамагаюць вырашаць праблемы, трэба размаўляць адзін з адным», — сказаў Паўль Фрыдрых фон Фурхер.

**Прэс-служба прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



## У каталікоў — Вялікдзень, Вербніца — у праваслаўных



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Пад сузор'ем велічных духоўных свят прайшла мінулая нядзеля ў гарадах і вёсках краіны. Каталікі славілі Уваскрэсенне Хрыстова, праваслаўныя адзначалі Уваход Гасподні ў Іерусалім. Храмы, поўныя вернікаў, сведчылі пра незаменнасць адвечных хрысціянскіх каштоўнасцяў. Адухоўленыя твары рабілі гэты свет яшчэ святлейшым. «Хрыстос Уваскрэс!» — вітаюцца каталікі і ўніяты. «Вярба б'е — здароўе дае. Праз тыдзень Вялікдзень!»— віншуюць адно аднаго праваслаўныя. Святы, якія поўняць жыццё глыбокім сэнсам і прымушаюць памятаць галоўныя ісціны жыцця!**

**На фотаздымках, зробленых у архікатэдральным касцёле імя Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мінску і каля ўвахода ў праваслаўны Свята-Ільінскі храм у Радашковічах — гэта толькі два з мільёнаў тых імгненяў, якімі была асвечана наша Вербна-Велікодная нядзеля.**



**Сяргей МАРТЫНАЎ, міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь:**

***Палітыка санкцый, якую вядзе Еўрапейскі саюз у дачыненні да Беларусі, бесперспектыўная. І не таму, што нашай краіне не падабаецца палітыка ціску і прымусу, а таму, што яна з'яўляецца неэфектыўнай. Можна згадаць словы былога прэзідэнта Францыі Жака Шырака пра тое, што санкцыі — гэта ржавая шабля, бразганне якой не дае вынікаў.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.04.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8090,00 | ▼ |
| Еўра | 10580,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 273,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1008,23 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 8° |
| Віцебск | + 6° |
| Гомель | + 4° |
| Гродна | + 8° |
| Магілёў | + 7° |
| Мінск | + 6° |

# РАЗМЕРКАВАННЕ — САМЫ АДКАЗНЫ МОМАНТ У ЖЫЦЦІ ВЫПУСКНІКА

**Ці можна пазбегнуць размеркавання пасля заканчэння ВНУ? Як задаволіць дзяржаўны інтарэс да ўласнай персоны і не парушыць пры гэтым свае жыццёвыя планы? У якім выпадку можна пераразмеркавацца? Ці магчыма размеркавацца ў прыватную кампанію? Што змянілася ў парадку размеркавання выпускнікоў пасля ўступлення ў сілу Кодэкса аб адукацыі? Падчас сустрэчы з прадстаўнікамі цэнтральнага апарата Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі студэнты Белдзяржуніверсітэта літаральна засыпалі іх сваімі пытаннямі. Усе нюансы будучага размеркавання студэнцкай моладзі тлумачылі намеснік старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА і галоўны прававы інспектар працы ЦК прафсаюза Ларыса МАНЮК:**

### ХТО ПАДЛЯГАЕ АБАВЯЗКОВАМУ РАЗМЕРКАВАННЮ?

Да ўступлення ў сілу Кодэкса аб адукацыі маладымі спецыялістамі лічыліся выпускнікі, якія на момант заканчэння ВНУ навучаліся за кошт бюджэтных сродкаў, прычым не мела значэння, за якія сродкі яны атрымлівалі адукацыю яшчэ паўгода таму — за свае ці за бюджэтныя. Цяпер абавязковаму размеркаванню падлягаюць усе, хто правучыўся на дзённай бюджэтнай форме навучання не менш за палову ад агульнага тэрміну навучання. Гэта значыць, што студэнт, які навучаўся за кошт бюджэтных сродкаў і быў адлічаны, напрыклад, на трэцім—чацвёртым курсе, а затым аднавіўся і давучваўся ўжо за кошт уласных сродкаў, таксама можа быць размеркаваны. Пры гэтым тэрмін працы па размеркаванні не змяншаецца прапарцыянальна часу навучання за кошт уласных сродкаў. Гэта значыць, што выпускнік будзе абавязаны адпрацаваць па размеркаванні

> **«Выпускнік мае права адмовіцца ад работы па размеркаванні і добраахвотна вярнуць дзяржаве сродкі, выдаткаваныя на яго падрыхтоўку»**

два гады, як і яго аднакурснікі-«бюджэтнікі». А вось пры разліку сумы, якую выпускнік абавязаны будзе вярнуць дзяржаве ў якасці кампенсацыі за сваё нежаданне працаваць па размеркаванні, гады яго платнага навучання ўключацца не будуць.

Калі студэнт больш за палову тэрміну вучыўся за кошт бюджэтных сродкаў, а затым перавёўся на платнае завочнае аддзяленне, то ён таксама падпадае пад размеркаванне. За выключэннем выпадку, калі ён працуе па сваёй спецыяльнасці.

### ЯКІМ ЧЫНАМ ВА ЎСТАНОВЕ АДУКАЦЫІ ВЫЗНАЧАЕЦЦА ЧАРГОВАСЦЬ РАЗМЕРКАВАННЯ СТУДЭНТАЎ І ЦІ МОЖА ВЫПУСКНІК РАЗЛІЧВАЦЬ НА ЗАДАВАЛЬНЕННЕ ПЕРСАНАЛЬНАЙ ЗАЯЎКІ?

Згодна з п.14 новага Палажэння рашэнне аб размеркаванні выпускніка прымаецца з улікам:

- ✓ вынікаў яго паспяховасці;
- ✓ удзелу ў навукова-даследчай дзейнасці, грамадскай рабоце;
- ✓ месца праходжання вытворчай і пераддыпломнай практыкі;
- ✓ стану здароўя, сямейнага становішча і месца жыхарства сям'і;
- ✓ рэкамендацыі ўстановы адукацыі аб найбольш мэтазгодным накіраванні выпускніка на працу і яго асабістых пажаданняў.

Выпускнікі, якія размяркоўваюцца ў ліку першых, тэарэтычна маюць перавагу ў выбары будучага месца працы, паколькі колькасць заявак, з якіх яны могуць выбіраць, у іх намнога большая. Але існуе і паняцце чарговасці заявак. Да новаўвядзенняў сёлетняга размеркавання трэба аднесці з'яўленне такога паняцця, як «базавая арганізацыя». Гэта структура, якая заключае дагавор з установай адукацыі аб узаемадзеянні і, адпаведна, бярэ на сябе абавязацельствы па забеспячэнні студэнтаў працоўнымі месцамі для практыкі і працаўладкаванні маладых спецыялістаў. СТАР 6

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### 23-га — ПА РАСКЛАДЗЕ НЯДЗЕЛІ

**У сувязі з Радаўніцай, а таксама пераносам працоўнага дня з панядзелка 23 красавіка на суботу 28 красавіка, дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» удакладніла, як будуць у гэты час выконвацца рэгулярныя рэйсы па міжгародніх маршрутах.**

Так, у перыяд з 20 па 24 красавіка пасажырам пры планаванні падарожжа ў іншыя гарады трэба ўлічваць, што 20 і 21 красавіка названыя рэйсы будуць весціся па графіках пятніц, 22 красавіка — па графіку суботы, 23 і 24 красавіка — па раскладзе нядзельных дзён.

### АПАЛУБКА ЎПАЛА НА РАБОЧАГА

**Пры ўзвядзенні другога паверха шматкватэрнага жылога дома ў жылым квартале «Лебядзіны» па праспекце Пераможцаў у сталіцы здарылася бяда: каркасная апалубка ўпала на 42-гадовага цесляра.**

— Работнікі МНС з выкарыстаннем насілак і рыштунку альпіністаў даставілі мужчыну да машыны хуткай медыцынскай дапамогі, — паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС. — Пацярпелага шпіталізавалі з мноствам траўмаў. Здарэнне адбылося ўдзень, на аказанне дапамогі спатрэбілася менш за паўгадзіны пасля выкліку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ВЫЕЗД АДМЯНЯЕЦЦА

**Упраўленне КДБ па Віцебскай вобласці і пагранічнікі Полацкага пагранатрада спынілі спробу арганізацыі канала нелегальнай міграцыі.**

Двое расіян і грамадзянін Індыі, які пастаянна пражывае ў Расіі, спрабавалі наладзіць канал перапраўкі замежнікаў з краін азіяцкага рэгіёна праз Беларусь на тэрыторыю Латвіі, а затым — Германіі і іншых краін Еўрасаюза. Для гэтага злачынцы паспрабавалі перадаць хабар — 2 тысячы долараў — службовым асобам пагранічнай службы. Такім чынам чацвёра замежнікаў павінны былі атрымаць магчымасць выехаць з Беларусі ў Латвію па-за ўстаноўленых пунктаў пропуску. У выпадку, калі канал «запрацуе» без перабояў, узнагароджанне за кожнага чалавека склала б не 500, а 1000 долараў за чалавека.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ГРЭКІ ПАДПАЛІЛІ МІНІСТЭРСТВА АДМІНІСТРАЦЫЙНАЙ РЭФОРМЫ



У міністэрстве адміністрацыйнай рэформы Грэцыі ў ноч на 9 красавіка адбыўся пажар: у будынак кінулі бутэльку з запальнай сумессю. У выніку пажару амаль цалкам выгараў першы паверх прылеглай да міністэрства прыбудовы, таксама пацярпелі прыпаркаваныя побач аўтамабілі. Мясцовая паліцыя падазрае ў нападзе антыўрадавых дэманстрантаў, якія такім чынам ужо спрабавалі падпаліць некалькі банкаў, урадавых будынкаў, замежных пасольстваў і прадстаўніцтваў буйных кампаній.

### ВА УКРАІНЕ 140 НЕЛЕГАЛЬНЫХ МІНІ-НПЗ

Ва Украіне працуе каля 140 нелегальных нафтаперапрацоўчых міні-заводаў, якія выпускаюць нафтапрадукты нізкай якасці, не плацяць падаткі і дэстабілізуюць сітуацыю на рынку нафтапрадуктаў. Пра гэта ў эфіры Першага нацыянальнага тэлеканала заявіў міністр энергетыкі і вугальнай прамысловасці Украіны Юрый Бойка. Міністр запэўніў, што ўрад Украіны будзе трымаць сітуацыю пад кантролем. У прыватнасці, плануецца закрыць нелегальныя міні-НПЗ, увесці плаваючыя акцызныя стаўкі на бензін.

### УСЯГО 1 ПОРЦЫЯ ЯГАД У ТЫДЗЕНЬ АБАРОНІЦЬ МОЗГ АД УЗРОСТАВЫХ ЗМЯНЕННЯЎ

Калі кожны тыдзень з'ядаць па кубку ягад, верагоднасць развіцця хваробы Паркінсона зменшыцца на чвэрць, робяць выснову эксперты з Гарварда і Універсітэта Усходняй Англіі. Дапамогуць любыя прадукты, багатыя на флаваноіды (у іх лік уваходзяць таксама яблыкі, гарбата і чырвонае віно), піша The Telegraph. Аналіз дыеты, ладу жыцця і іншых фактараў дазволіў устанавіць: людзі, якія спажываюць вялікую колькасць флаваноідаў з ежай, на 40% радзей пакутавалі ад хваробы Паркінстана. Мяркуючы па ўсім, ягады таксама абаранялі ад узроставых змяненняў, змяншалі рызыку хвароб сэрца, гіпертаніі, некаторых відаў раку. А падклас флаваноідаў — антацыяны — захоўвалі клеткі мозга.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЗША НАКІРАВАЛІ Ў ПЕРСІДСКІ ЗАЛІЎ ДРУГІ АВІЯНОСЕЦ

**Камандаванне ВМС ЗША накіравала ў Персідскі заліў ударную авіяносную групу на чале з авіяносцам «Энтэрпрайз». Яна стане на баявое дзяжурства разам з аналагічнай групай на чале з авіяносцам «Авраам Лінкальн».**

Прадстаўнік камандавання Пятага флоту ВМС ЗША Эмі Дэрык-Фрост заявіла, што за апошнія дзесяць гадоў адразу два авіяносцы прысутнічалі ў акваторыі Персідскага заліву толькі чатыры разы. Пры гэтым яна адмовілася звязваць гэты факт з тым, што адбываецца з Іранам, растлумачыўшы, што авіяносцы займаюцца падтрымкай дзеянняў амерыканскіх вайскоўцаў у Афганістане і барацьбой з пірацтвам каля берагоў Самалі.



Цікава, што другі авіяносец прыйшоў у заліў за некалькі дзён да пачатку перамоў па іранскай ядзернай праграме, якія павінны пачацца ў суботу ў Турцыі. Чакаецца, што падчас гэтых перамоў краіны Захаду ў жорсткай форме запатрабуюць, каб Тэгеран адмовіўся ад далейшага ўзбагачэння ўрану. У адваротным выпадку Іран можа сутыкнуцца з новымі, больш суровымі санкцыямі.

НАДВОР'Е

### У ЧАЦВЕР ПАЦЯПЛЕЕ ДА +20

**На гэтым тыдні надвор'е ў Беларусі істотна палепшыцца і стане даволі цёпла і камфортна, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Толькі сёння ўдзень месцамі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях пройдзе невялікі мокры снег. На астатняй тэрыторыі без ападкаў. Тэмпература паветра ўдзень 2—8 цяпла, а ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — да плюс 10 градусаў. У сераду і чацвер у краіне захаваецца павышаны атмасферны ціск, таму ападкаў амаль не будзе, толькі ўдзень 12 красавіка ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях месцамі магчымы кароткачасовы дождж і навальніцы. Тэмпература паветра ў ноч на сераду яшчэ ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень 7—13 цяпла, на захадзе краіны — плюс 14—16 градусаў. У чацвер стане на 2—3 градусы цяплей. Так, у ноч на чацвер чакаецца ад мінус 2 да плюс 5, удзень — 10—17 цяпла.

У пятніцу ўначы чакаецца ўжо 1—8 цяпла, а ўдзень нават плюс 14—21 градус. Аднак менавіта ў пятніцу месцамі магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Паводле папярэдніх прагнозаў, даволі цёпла будзе і ў выхадныя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## КІМ ВЫ ХАЦЕЛІ СТАЦЬ У ДЗЯЦІНСТВЕ, ЯКУЮ ПРАФЕСІЮ ЎРЭШЦЕ АБРАЛІ І ЦІ ЗМЯНІЛІ Б СВОЙ ПРАЦОЎНЫ ЛЁС?

**Ларыса ПАСЯЛЕНЦАВА, старшыня СВК «17 партз'езд» Слаўгарадскага раёна:**



— Я нарадзілася ў вёсцы, а таму заўсёды думала пра сельскія прафесіі. Разважала такім чынам: медыкам я быць не магу — не выношу крыві, настаўнікам — нестае цярплівасці ў стасунках з дзецьмі. Так што хацела стаць агароднікам (вельмі ж любіла таматы) альбо аграномам. І ўжо дакументы падрыхтавала на паступленне ў сельскагаспадарчую акадэмію менавіта на гэтую спецыяльнасць, але ў апошні момант вырашыла вывучаць там жа бухгалтарскі ўлік. Гэта падалося больш перспектыўным, асабліва для жанчыны. Я задаволена сваёй цяперашняй працай кіраўніка сельскай гаспадаркі, але і бухгалтарскі вопыт мне шмат чаго даў. Я ўмею лічыць грошы, эканоміць іх, размяркоўваць. Наш «17 партз'езд» стаў цяпер лепшай гаспадаркай у Слаўгарадскім раёне, і я ганаруся гэтым! Калі б пачынала нанова, нічога б не мяняла: любому кіраўніку яшчэ ніколі не шкодзіла добрая эканамічная падрыхтоўка.

**Анатоль ЛЮБЧАНКА, старшыня Савета Магілёўскай абласной арганізацыі ветэранаў:**



— Я належу да пасляваеннага пакалення, мы шмат чаго бачылі і перажылі. Таму невыпадкова, што спачатку я выбраў для сябе Львоўскае артылерыйскае вучылішча. Вось толькі не паспеў апусціць пісьмо з дакументамі ў паштовую скрыню, бо памяняў рашэнне пасля рады сваякоў. Справа ў тым, што жылі мы бедна, разлічваць на дапамогу бацькоў не выпадала — сяляне за тым часам працавалі не за грошы, а за палачкі працадзён. Таму мне трэба было думаць, як самастойна сябе забяспечваць. З дапамогай газеты знайшоўся ў Мінску лесатэхнічны інстытут імя Кірава, дзе нават пры здавальняючых адзнаках плацілі стыпендыю. Гэта ўсё і вырашыла. Потым я працаваў у лясной гаспадарцы, а далей пайшоў па камсамольскай і партыйнай лініі, працаваў у прафсаюзах. Хоць мара мая ўсё ж такі засталася — быць ваенным чалавекам. У мяне і выпраўка страявая, і ў Афганістане мне больш за год давялося служыць. А ўвогуле я ні пра што не шкадую і нічога б не мяняў у сваім жыцці.

**Ірына АКУЛОВІЧ, дырэктар тэлерадыёкампаніі «Магілёў»:**



— У дзяцінстве я не марыла, а проста заўсёды дакладна ведала, што буду настаўніцай. Мае бацькі — настаўнікі, і я нават не ўяўляла сабе, што можна мець іншую прафесію. Так і атрымалася: пасля заканчэння ўніверсітэта я атрымала дыплом настаўніцы пачатковых класаў з выкладаннем музыкі, працавала ў школе. Мне падабалася мая праца, і я добра ладзіла з дзецьмі. Пакуль аднойчы мяне не ўгаварылі прыняць удзел у конкурсе на мясцовай студыі тэлебачання. Я ўрэшце пайшла — ды там і засталася. У мяне няма прафесійнай адукацыі, але я сябе ў іншай справе проста не ўяўляю. Калі б усё пачаць спачатку, можа, занялася б яшчэ і тэлевізійнай рэжысурай. І калі хто цяпер з моладзі вагаецца пры выбары будучай прафесіі — па разліку ці па любові? — для мяне тут няма ніякіх сумненняў: толькі па любові!

## У БЕЛАРУСІ БУДЗЕ СТВОРАНА АДРАСНАЯ СІСТЭМА

**У Беларусі будзе створана адрасная сістэма, якая ўключае інфармацыю аб адрасах аб'ектаў нерухомай маёмасці, а таксама аб назвах і межах абласцей, раёнаў, сельсаветаў і населеных пунктаў. Адпаведны ўказ № 160 «Аб адраснай сістэме» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 9 красавіка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Стварэнне гэтай сістэмы дасць магчымасць забяспечыць аднолькавасць адраснай інфармацыі пры выкананні дзяржаўнымі органамі ўскладзеных на іх функцый, выключыць наяўнасць аднолькавых адрасоў у розных аб'ектаў нерухомай маёмасці. Гэта таксама дасць магчымасць уключаць у сістэму адрасоў інфармацыю аб месцазнаходжанні не толькі зарэгістраванай нерухомай маёмасці, але і незарэгістраваных аб'ектаў (для гэтых мэт прадугледжваецца правядзенне работы па сістэматычным прысваенні адрасоў).

Пры гэтым змяненне адрасоў не запатрабуе ўнясення адпаведных змяненняў ва ўстаноўчыя дакументы юрыдычных асоб і пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі), дакументы аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання, іншыя дакументы, якія змяшчаюць звесткі аб іх месцы жыхарства, месцы знаходжання і (або) аб адрасе. Такія змяненні будуць уносіцца ў дакументы адначасова з унясеннем у іх іншых змяненняў у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

Органам, які забяспечвае стварэнне і веданне адраснай сістэмы, указам вызначаецца Дзяржаўны камітэт па маёмасці.

## БЕЛАРУСЬ ГАТОВА ВЯРНУЦЦА ДА ДЫЯЛОГУ З ЕЎРАСАЮЗАМ ПАСЛЯ СПРЫЯЛЬНАГА ДЛЯ КРАІНЫ РАШЭННЯ САВЕТА ЕС

**Аб гэтым заявіў 6 красавіка журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы маем намер пачакаць чарговага рашэння Савета ЕС, якое адбудзецца ў канцы красавіка, дзе будзе абмяркоўвацца беларускае пытанне. Мы гатовы да таго, каб пачаць нармальны, спакойны дыялог. Узаемаразуменне, лічу, будзе дасягнута вельмі хутка. І рашэнне ЕС (калі будзе прынята ў духу дыялога) стане выдатным фонам для вяртання паслоў ЕС у Беларусь», — сказаў Уладзімір Макей. Паводле яго слоў, Беларусь «гатова да такога варыянта развіцця падзей».

Ён падкрэсліў, што Беларусь «заўсёды была гатова да нармальнага ўзаемапаважлівага дыялога з ЕС». «Мы спадзяёмся, што дыялог вернецца ў канструктыўнае рэчышча. Думаецца, што гэта ў інтарэсах і нашых, і еўрапейскіх партнёраў. Але гэта павінен быць раўнапраўны, узаемапаважлівы дыялог», — адзначыў ён. На жаль, цяпер дзеячы еўрапейскіх краін думаюць больш аб тым, як захаваць свой твар, а не аб тым, як не страціць Беларусь, лічыць Уладзімір Макей.

«Не мы былі ініцыятарамі эскалацыі напружанасці. Мы абмежаваліся сімвалічнай рэакцыяй, нават на апошні віток санкцый», — нагадаў кіраўнік Адміністрацыі.

Еўрасаюз у адносінах з Беларуссю робіць стаўку на апазіцыю, а не на дыялог з афіцыйнай уладай, заявіў Уладзімір Макей.

На думку кіраўніка Адміністрацыі, у існуючай сітуацыі «не застаецца нічога іншага, акрамя як думаць, што рэальна Захаду дыялог з Беларуссю не патрэбны». «Яны робяць стаўку на апазіцыю. Яны адкрыта гавораць аб тым, што лідары апазіцыі, маргінальныя па сваёй сутнасці, павінны прыйсці да ўлады, а апошнім часам адкрыта гучыць і такая тэма: гэтыя лідары павінны забяспечыць ім прыватызацыю пад сябе дзяржаўнай уласнасці і рэсурсаў, якія былі створаны беларускім народам», — падкрэсліў Уладзімір Макей. У якасці яскравага прыкладу ён прывёў адну з апошніх заяў еўракамісара Андрыса Піебалгса ў ходзе апошняга пасяджэння Еўрапарламента, сутнасць якой зводзіцца да наступнага: мы ўжо гатовы есці беларускі пірог, як толькі наступяць зручныя ўмовы, гэта значыць як толькі апазіцыя прыйдзе да ўлады.

Уладзімір Макей звярнуў увагу на тое, што за кожным ударам па нашай краіне і народу з боку ЕС стаяць канкрэтныя лідары апазіцыі, якія заклікаюць да ўвядзення і ўзмацнення санкцый супраць канкрэтных прадпрыемстваў, грамадзян і супраць краіны ў цэлым. Прычым іх заклікі не мяняюцца з году ў год. «Я ўспамінаю свае сустрэчы з Калякіным і Лябедзькам, калі працаваў у Савеце Еўропы, а яны выступалі на пасяджэннях розных камітэтаў. Гэта было ў канцы 90-х гадоў. Паверце: нічога не змянілася. Тыя ж самыя фразы гучаць і сёння: таталітарны рэжым і санкцыі», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі.

Ён нагадаў, як адзін з дзеячаў БНФ нейкі Піменаў заклікаў нават да таго, каб увесці войскі НАТА на тэрыторыю Беларусі нібыта для абароны незалежнасці краіны. «І апазіцыя цалкам складаецца з такіх вось піменавых», — сказаў Уладзімір Макей. Ён падкрэсліў, што апазіцыя ў Беларусі «не мае масавай падтрымкі сярод людзей», узоры брусельскай брусчаткі ёй знаёмы больш, чым малюнкі тратуараў у Хойніках або Брагіне. Непрадуманымі дзеяннямі, накшталт заклікаў да санкцый, апазіцыя адштурхоўвае ад сябе людзей. «Сёння паступаюць іскі ад працоўных калектываў, работнікі якіх патрабуюць кампенсаваць урон, нанесены ад увядзення санкцый...» — адзначыў Уладзімір Макей.

«Сваімі абсурднымі дзеяннямі апазіцыя давяла сябе да таго, што людзі ад яе дзеячаў шарахаюцца, як ад пракажоных. А што самае галоўнае для любой палітычнай сілы? Мець падтрымку сярод народа. Адсутнасць такой падтрымкі — і як вынік будзе палітычнае забыццё», — упэўнены кіраўнік Адміністрацыі.

«Калі еўрапейскія палітыкі сапраўды хочуць, каб Беларусь і далей паступальна ішла па шляху развіцця дэмакратыі ў еўрапейскім разуменні гэтага слова, каб грамадзянская супольнасць і далей развівалася і была палітычна сталай, дасведчанай, каб палітычная сістэма і далей удасканальвалася, каб еўрапейскія каштоўнасці і далей укараняліся, то дзейнічаць трэба іншымі метадамі. Санкцыі толькі аддаляюць нас ад гэтай мэты», — падкрэсліў Уладзімір Макей. Ён адзначыў, што ў Беларусі ніхто не ставіць пад сумненне тое, аб чым так часта гавораць еўрапейскія палітыкі: што Беларусь павінна быць незалежнай, дэмакратычнай дзяржавай, у ёй павінна прысутнічаць развітая, палітычна сталая грамадзянская супольнасць, якая павінна быць максімальна ўключана ў кіраванне дзяржаўнымі працэсамі. «Усё гэта зразумела і ўсе згодны з гэтым. Але якія метады выбраны? ...Размова з намі вядзецца толькі на мове пагроз і шантажу».

## БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ ЗНЯЛІ ЎСЕ РОЗНАГАЛОССІ ПА ПАСАЖЫРСКІХ АВІЯПЕРАВОЗКАХ

**Пра гэта заявіў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль КАЛІНІН, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы знялі ўсе рознагалоссі ў галіне пасажырскіх авіяперавозак і дамовіліся, што ў летні перыяд будзем лятаць з частатой пяць на пяць: пяць з беларускага і пяць з расійскага боку», — заявіў Анатоль Калінін.

Паводле яго слоў, галоўнае, на што арыентаваліся бакі падчас перагавораў, гэта інтарэсы пасажыраў. «Галоўнае для авіяперавозчыка — зручнасць пасажыраў. Трэба прадаставіць столькі частот, каб і бізнэс-супольніцтвы, і турысты, і іншыя грамадзяне маглі свабодна і ў любы час ажыццяўляць палёты. Эканамічнае пытанне — другаснае», — адзначыў ён.

Як паведамлялася, спрэчкі паміж авіяцыйнымі ўладамі дзвюх краін адбыліся з-за колькасці рэйсаў, якія выконваюцца паміж Мінскам і Масквой.

**Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі з заўчаснай смерцю намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь КАРАЛЁВАЙ Валянціны Вікенцьеўны і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім у сувязі з напаткаўшым іх горам.**

**Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» глыбока смуткуе з выпадку раптоўнай смерці намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ — кампетэнтнага спецыяліста, надзейнага памочніка і дарадцы журналістаў, з чыёй дапамогай падрыхтавана шмат глыбокіх, цікавых матэрыялаў па пытаннях пенсійнага забеспячэння, арганізацыі сацыяльнай падтрымкі людзей. Валянціна Вікенцьеўна актыўна адгукалася на любыя прапановы аб супрацоўніцтве, яе парады і каментарыі рабілі матэрыялы ўзважанымі, глыбокімі, запамінальнымі. Выказваем самыя шчырыя спачуванні яе родным, блізкім, усім, хто яе ведаў.**

# НОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ — НОВЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ

### Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР правёў прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў СМІ вобласці

**У кароткім уступным слове кіраўнік рэгіёна адзначыў некаторыя тэндэнцыі развіцця эканомікі, якія можна назіраць па першых месяцах гэтага года. Зніжэння аб'ёмаў прамысловай прадукцыі ў параўнанні з мінулым годам не дапушчана. У лютым сярэднямесячная заработная плата па вобласці склала 2550,7 тыс. рублёў. Як паказваюць разлікі, запланаваны рост рэальнай зарплаты на 4,5% за гэты год выглядае рэальна. Знешнегандлёвыя аперацыі ў першыя месяцы года маюць станоўчае сальда.**

У фармаце «пытанне-адказ» зноў прагучала тэма дольшчыкаў будаўнічай фірмы «Аблічча». Аб праблемнай сітуацыі вакол будаўніцтва жылля гэтай фірмай пісалі нямала. І наша газета неаднойчы звярталася да гэтай тэмы. Сотні брастаўчан унеслі грошы на рахунак будаўніцтва кватэр, а фірма развалілася. Людзі пісалі і хадзілі на прыёмы да кіраўнікоў усіх рангаў, былі і суды. У рэшце рэшт улада знайшла магчымае выйсце са складанай сітуацыі. Незавершанае будаўніцтва было перададзена будаўнічаму трэсту № 8. Сфарміраваны новыя ЖБК. Людзі ўзялі дадатковыя крэдыты, і будаўніцтва працягваецца. Адзін з жылых дамоў (у раёне вяслярнага канала), які пачынала «Аблічча», ужо заселены. Губернатар адзначыў, што з 315 дольшчыкаў былой фірмы 314 працягнулі дагаворы ўжо з будтрэстам № 8. Такім чынам, праблема паступова вырашаецца.

Нямала пытанняў датычылася ўзвядзення новых прадпрыемстваў. Так, удзельнікі сустрэчы даведаліся, што ўжо сёлета ўступіць у строй чацвёртая чарга Івацэвіцкага кукурузна-камбікормавага завода. Вялікае будаўніцтва вядзецца ў Маларыцкім раёне на месцы багатага радовішча мелу. Адзін завод па вытворчасці сілікатнай цэглы там ужо дзейнічае, ідзе мантаж абсталявання для прадпрыемства па вытворчасці блокаў. Зараз знаходзіцца ў рабоце праектна-каштарысная дакументацыя па вапнавым заводзе. Магчыма будаўніцтва горна-абагачальнага камбіната ў Лунінецкім раёне на месцы радовішча будаўнічага каменю «Сітніцкае».

Вынікам рэалізацыі інвестыцыйных праектаў з удзелам замежнага капіталу стаў шэраг будоўляў — такіх, як завод па вытворчасці палімерных матэрыялаў у Камянцы і флізелінавая фабрыка ў Антопалі Драгічынскага раёна.

Журналісты пацікавіліся таксама вынікамі нядаўняй рабочай паездкі Канстанціна Сумара ў Ізраіль і вось пра што даведаліся. Атрымала развіццё супрацоўніцтва з буйной ізраільскай кампаніяй «Merhav Ltd». Шэсць гадоў таму з гэтай фірмай заключылі першыя дагаворы. У выніку ў Белаазёрску пабудавана прадпрыемства па вырошчванні афрыканскага соміка на 700 тон рыбы ў год. Падчас цяперашняй паездкі падпісана новая дамова. Яна прадугледжвае будаўніцтва новай чаргі прадпрыемства, таксама на 700 тон афрыканскага соміка, камбікормавага завода для забеспячэння рыбы кармамі і арганізацыю вытворчасці вырошчвання рыб асятровых парод у Пінскім раёне. Далей стане магчымым будаўніцтва буйнога рыбаперапрацоўчага завода.

Губернатар ацаніў як рэальны праект па будаўніцтве завода медыцынскіх прэпаратаў у свабоднай эканамічнай зоне «Брэст». Засталося вырашыць некаторыя арганізацыйныя пытанні, і ўжо ў маі стане магчымым падпісанне дагавора. А новыя вытворчасці — гэта, як вядома, і новыя працоўныя месцы, дадатковыя падаткі ў бюджэт.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# САДЗЕЙНІЧАЦЬ КАНТАКТАМ, А НЕ АБМЯЖОЎВАЦЬ ІХ

**Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў:**



**— На жаль, мы ўжо можам казаць пра найноўшую гісторыю прымянення санкцый супраць Беларусі. Гэта і абмежаванні па ўездзе, і пазбаўленне прэферэнцый нашых тавараў лёгкай прамысловасці ў сувязі з ініцыятывай Еўрапейскіх прафсаюзаў, і абмежаванні ў выдачы віз пэўным чыноўнікам, і пашырэнне гэтага спісу... Цяпер туды ўпершыню ўключаны прадпрымальнікі, якія быццам бы супрацоўнічаюць з уладай.**

— Гэта тэма вельмі шырока абмяркоўваецца ў беларускай бізнэс-суполцы. Яна прагучала і на XIII Асамблеі дзелавых колаў Рэспублікі Беларусь, якая прайшла 29 лютага ў Мінску. У рэзалюцыі, накіраванай кожнаму кіраўніку ўрада і парламента еўрапейскіх краін, мы дакладна сфармулявалі тэзісы пра неабходнасць дапамагаць беларускаму бізнэсу пашыраць гарызонты супрацоўніцтва з іншымі краінамі.

Мы не раз падкрэслівалі, што выступаем супраць любых санкцый. Тры гады таму я пра гэта казаў на пасяджэнні Сацыяльна-эканамічнага камітэта Еўрапейскага саюза, куды быў запрошаны ў якасці эксперта. Падкрэсліваў, што любыя санкцыі супраць бізнэсу, абмежаванні нейкіх праграм (у Беларусь не прыйшла праграма FR, была ўсечаная праграма TACIC) не садзейнічаюць развіццю дэмакратыі. Дэмакратыя — гэта сярэдні слой, а сярэдні слой — гэта малы і сярэдні бізнэс.

Беларусь — адкрытая краіна, новая, маладая дзяржава. Нам усяго толькі 20 гадоў. І мы сутыкнуліся з вялізнымі праблемамі, выкліканымі чарнобыльскай катастрофай, адсутнасцю трох пакаленняў прадпрымальніцтва ў краіне, калі мы жылі за жалезнай заслонай.

Трэба садзейнічаць кантактам людзей, а не абмяжоўваць іх. Мы лічым, што санкцыямі не вырашацца ніякія пытанні. Наадварот, санкцыі нараджаюць недавер, варожасць, канфрантацыю. Ні ў эканоміцы, ні ў палітыцы, ні ў чалавечых стасунках гэта не дапамагае. Гэта метады састарэлага арсеналу.

Тыдзень таму я ўдзельнічаў у прэзентацыі праграмы «Еўрапейскі дыялог па мадэрнізацыі Беларусі» ў Брусэлі. Там прысутнічалі прадстаўнікі апазіцыйных арганізацый, грамадзянскай супольнасці і дыпламатычнага корпусу Беларусі. Вёў пасяджэнне еўракамісар Штэфан Фюле. На другі дзень я меў магчымасць сустрэцца з Вальтэрам Групам, генеральным сакратаром Еўрапейскай канфедэрацыі асацыяцый малых і сярэдніх прадпрыемстваў (CEA-PME), правадзейным членам якой з'яўляецца Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў.

Гэта адна з уплывовых еўрапейскіх арганізацый. Я кансультаваўся з Вальтэрам Групам па гэтым пытанні, і ён падзяляе нашу думку пра тое, што бізнэс — па-за палітыкай. Асабліва — асацыяцыі і саюзы. Сваё непрыманне санкцый і абмежаванняў я выказаў і на гэтай сустрэчы, і падчас размовы з апаратам супрацоўнікаў еўракамісіі па пытаннях пашырэння Еўрасаюза і еўрапейскай палітыкі суседства. Сам Фюле — актыўны, разумны чалавек, мы сустракаліся з ім і ў Беларусі. Наша меркаванне было выслухана. Я перадаў у Еўрапарламент ліст ад міністра прамысловасці Беларусі Анатоля Харлапа, дзе выказваецца асцярога, што ў выніку санкцый можа быць нанесена вялікая шкода менавіта бізнэсу і рынкавай эканоміцы Беларусі, якія развіваюцца.

Мы лічым, што думкі можна даносіць шляхам мірнага дыялогу, асабліва ў сучасным свеце. Свет глабальны і адначасова крохкі. Мы за тое, каб Беларусь была краінай са шматвектарнай знешняй палітыкай. Як толькі зачыняюцца нейкія дзверы на Захад, шырэй расчыняецца брама на Усход. Гэта выклікае дэфармацыю ў аспектах міжнародных адносін, з'яўляюцца краіны-дамінанты. Малы і сярэдні бізнэс у гэтым не зацікаўлены.

Рэпрэсіўныя захады прымяняюцца, калі палітыкі не здольны дасягнуць дамоўленасці. Але разумныя людзі не б'юцца, а дамаўляюцца, вырашаюць спрэчныя пытанні ў працэсе дыялогу.

Сёлета Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва адкрывае свае прадстаўніцтвы ў Лейпцыгу і Берліне. Калі я паведаміў пра гэта ў Брусэлі, прадстаўнікі Еўрапейскай канфедэрацыі спыталі: «А чаму не тут? Вы б тады маглі больш актыўна выказваць сваю пазіцыю». Мы зараз вывучаем гэта пытанне. Напэўна, у наступным годзе адкрыем наша прадстаўніцтва і ў Брусэлі.

Вядома, мы б хацелі, каб дыялог з еўрапейскімі краінамі не перарываўся. Унутры Беларусі пачаўся дыялог бізнэсу, улады і грамадзянскай супольнасці. У нас ужо існуе досыць актыўны дыялог паміж бізнэсам і ўладай, штогод мы распрацоўваем Нацыянальную платформу бізнэсу Беларусі, якую заслухоўвае ўрад. Па такім жа метадзе трэба разварочваць і дыялог Еўрапейскаму саюзу з нашай краінай.

Гэта актуальна, як ніколі, не толькі для нас, але і для самой Еўропы, бо краіны ЕС зараз перажываюць крызіс, а ў Беларусі і Расіі — паслякрызісныя з'явы. Міжнароднае супрацоўніцтва і абмен вопытам у такой сітуацыі — адна з умоў выхаду са складаных сітуацый і пераадолення негатыўных з'яў у эканоміцы.

Толькі што наша дэлегацыя вярнулася з Італіі, мы былі на поўдні ад Неапаля, вывучалі вопыт стварэння прадпрымальніцкага горада, сустракаліся з нашым Ганаровым консульствам. Еўрапейцы маюць сур'ёзныя намеры разгортваць кантакты з Беларуссю, намячаецца шмат цікавых праектаў. Але мы баімся, што гэтая нікому не патрэбная канфрантацыя затармозіць развіццё праектаў, напрацаваных у апошнія гады.

Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва ўжо ўнесла карэктывы ў свае планы з-за няпэўнай сітуацыі, якая ўзнікла пасля прыняцця санкцый з боку Еўрапейскага саюза. Мы планавалі правесці ў кастрычніку Еўраазіяцкі форум малога і сярэдняга бізнэсу, але вымушаны яго перанесці да лепшых часоў.

**Падрыхтавала Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**<u>Кары ХЕЙКІЛЯ</u>:**

# «ПРА ТОЕ, ШТО ЎЗНАЧАЛЮ «ДЫНАМА», ЧЫТАЎ У ГАЗЕТАХ...»

**Сёння і заўтра на «Мінск-Арэне» нацыянальная зборная правядзе два паядынкі з камандай Швецыі ў межах Еўрапейскага хакейнага выкліку. Учора галоўны трэнер нашай каманды Кары Хейкіля сустрэўся з журналістамі і расказаў, як праходзілі нядаўнія спарынгі з аўстрыйцамі (першы з іх мы выйгралі 3:2, у другім саступілі 2:4) і цяперашні збор нацыянальнай дружыны, а таксама як рыхтуюцца яго падапечныя да чэмпіянату свету.**

— Пачнем з Аўстрыі. Першы матч атрымаўся нядрэнным. А вось у другім прыйшлося цяжка. Магчыма, з-за таго, што было шмат эмоцый, магчыма, сказалася стомленасць. Усё ж такі гулялі два дні запар. У КХЛ заўсёды ёсць хоць дзень адпачынку. У другім матчы мы не гулялі як каманда, не было дысцыпліны, гульцы збіваліся на індывідуальны хакей. Была магчымасць перамагчы ў канцоўцы, але не атрымалася. У другой гульні не выходзіў на лёд Дзянісаў, не будзе яго і ў матчах са Швецыяй. Нападаючыя, на жаль, няшмат забіваюць у КХЛ. Мы чакаем, каб лідары — Сцяпанаў, Дзямагін, Угараў — пачалі вызначацца на пляцоўцы. Нядрэнна праявіў сябе Коласаў. Гэта для мяне прыемны сюрпрыз. Мы ведаем, што зараз супраць шведаў і фінаў мы можам перамагаць. Але трэба быць камандай. У нас няма такога зорнага складу, як у Расіі пару гадоў таму — з Кавальчуком, Авечкіным, якія маглі без усялякага плана імправізаваць. Таму трэба гуляць як каманда.

**— Калі да зборнай далучыцца Міхаіл Грабоўскі?**

— Ён прылятае ў Мінск 21 красавіка.

**— Ці плануеце выкарыстоўваць Мільчакова і Стэфановіча?**

— Калі Стэфановіч на 100% будзе гатовы выйсці гуляць, ён згуляе. Шанц атрымаюць Місюль, Шведаў і Нагачоў. Усіх паглядзім у бліжэйшых матчах супраць моцнай каманды.

**— Ад паслуг каго з ігракоў пасля аўстрыйскіх спарынгаў вы вырашылі адмовіцца?**

— Яшчэ рана пра гэта казаць. Да чэмпіянату свету яшчэ могуць быць траўмы і іншыя сітуацыі.

**— Ці разлічваеце вы на братоў Касціцыных, якія зараз гуляюць у плэй-оф НХЛ?**

— 24 красавіка яны правядуць апошні матч серыі. Мяркую, супрацьстаянне будзе цікавым. А ўвогуле яны абяцалі адразу прыехаць, як скончыцца плэй-оф.

**— А што наконт Аляксея Калюжнага?**

— Апошні раз размаўлялі з ім у пятніцу. Таксама паабяцаў, што як толькі скончыцца серыя, далучыцца да зборнай.

**— А які склад прывязуць шведы?**

— Там будзе шмат маладых гульцоў, але яны нямала забіваюць і гуляюць у агрэсіўны хакей. Гэта вельмі мабільная каманда. Тактыка — заўсёды моцны бок шведскай каманды, там заўсёды высокая дысцыпліна.

**— Для вас, як для фіна, сустрэча са шведскай зборнай — своеасаблівае дэрбі...**

— Сапраўды, Швецыя — Фінляндыя — заўсёды дэрбі. Я 8 гадоў пражыў у Швецыі і ведаю краіну, менталітэт гульцоў. Але зараз пра гэта не думаю. Мне важна, як гуляе зборная Беларусі.

**— Наколькі вядома, матчы са Швецыяй перанеслі з выхадных на будныя дні па вашай ініцыятыве...**

— Пасля матчаў са Швецыяй мы хацелі б узяць невялікую паўзу і змяніць характар трэніровак. Мы будзем працаваць у іншым рэжыме, падцягваць «фізуху».

**— Пасля наша каманда паедзе ў Фінляндыю. У гульні супраць гэтай зборнай у вас таксама не будзе асаблівых пачуццяў?**

— Я шмат часу правёў у камандзе з горада Тамперэ, гэта была мая арэна. Я ведаю ўсіх, хто там працуе, там шмат маіх сяброў. Гэта будзе новая для мяне сітуацыя: вывесці зборную Беларусі на родную мне арэну.

**— Год таму ваш папярэднік Эдуард Занкавец прызнаў, што гульцы «Дынама» не гатовы быць на вядучых ролях, а больш гуляюць на стрымліванне. Вы гэта адчулі?**

— У нас сапраўды шмат хакеістаў, якія ў клубах выступаюць у трэціх-чацвёртых звёнах. Мы чакаем, калі да каманды падключацца гульцы вядучых звёнаў...

**— Ці здольная гэта каманда ўдала выступіць на чэмпіянаце свету?**

— Здольная, калі будзе гуляць як каманда.

**— Перад матчамі з Аўстрыяй вы доўга на лёдзе размаўлялі з Аляксандрам Кулаковым. Пра што, калі не сакрэт?**

— Аляксандр — вельмі тэхнічны гулец. У яго ёсць усё, каб быць паспяховым хакеістам. Але калі ён хоча гуляць, трэба выходзіць на наступны ўзровень. Лепш дрэнны кідок па варотах, чым дрэнны пас.

**— У хуткім часе сталічнае «Дынама» павінна вызначыцца з галоўным трэнерам. Сярод кандыдатаў называлася і ваша прозвішча...**

— Я таксама чытаў пра гэта ў газетах (*усміхаецца*).

**— Марэк Сікора казаў, што галоўным яго крытыкам заўсёды была жонка. Ці будзе ваша другая палова на трыбуне на матчах са Швецыяй?**

— Не, яна зараз у Фінляндыі. Але яна будзе ў Тамперы. Магчыма, там я адчую больш ціск (*усміхаецца*).

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## АДЗНАЧАЕЦЦА АГУЛЬНАЕ ЗНІЖЭННЕ ЗЛАЧЫННАСЦІ Ў КРАІНЕ

**Аб выніках работы Следчага камітэта за І квартал 2012 года Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку 9 красавіка далажыў Старшыня СК Валерый Вакульчык.**

Аляксандру Лукашэнку далажана аб праблемных пытаннях, выяўленых у рабоце Следчага камітэта як адзінага органа папярэдняга расследавання ў краіне з першых дзён яго дзейнасці, арганізацыі дасудовай вытворчасці па крымінальных справах.

Фарміраванне Следчага камітэта завершана, і гэтая структура пачала працаваць у поўным аб'ёме. «Сітуацыя мяне пераконвае ў тым, што мы не памыліліся ў фарміраванні незалежных следчых груп у абласцях, міжраённых, раённых следчых падраздзяленняў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць рашуча выкараніць любыя факты фармалізму ў рабоце следчых структур.

Як далажыў Валерый Вакульчык, Следчым камітэтам выконваюцца ўсе задачы, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы. Павышаецца якасць расследавання крымінальных спраў, выключаюцца магчымасці неабгрунтаванага прыцягнення да крымінальнай адказнасці.

Паводле інфармацыі Следчага камітэта, за І квартал гэтага года адзначаецца агульнае зніжэнне злачыннасці ў краіне ў параўнанні з папярэднім. Амаль на чвэрць знізілася колькасць забойстваў і асабліва цяжкіх злачынстваў, больш чым на трэць зменшылася колькасць разбойных нападаў. У той жа час адбыўся некаторы рост колькасці крадзяжоў.

Прэзідэнт паставіў задачу Следчаму камітэту сумесна з Генеральнай пракуратурай зрабіць вычарпальныя захады для таго, каб у самыя кароткія тэрміны забяспечыць якасць уліку злачынстваў і крымінальных спраў з тым, каб гэта адлюстроўвала рэальную карціну, не скажала рэальнае становішча спраў і садзейнічала эфектыўнасці работы праваахоўных органаў у справе барацьбы са злачыннасцю. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы запатрабаваў безумоўнага выканання ўсіх патрабаванняў крымінальна-працэсуальнага заканадаўства ў частцы, якая датычыцца расследавання крымінальных спраў, «каб людзі ведалі і разумелі, што Следчы камітэт створаны і існуе для таго, каб забяспечыць абарону правоў і інтарэсаў кожнага грамадзяніна ў прыватнасці і грамадства ў цэлым».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**


| | |
|---|---|
| Организация | **ОАО «БелСпецСбытСервис»** |
| Учетный номер плательщика | **191684429** |
| Вид деятельности | **деятельность агентов по торговле товарами широкого ассортимента** |
| Организационно-правовая форма | **открытое акционерное общество** |
| Орган управления | **директор** |
| Единица измерения | **млн.руб.** |
| Адрес | **г. Минск, ул. Аладовых, д. 17, офис 198/3** |

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2012**

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | - | 26 |
| в том числе: | | | |
| сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | - | 14 |
| расходы будущих периодов | 218 | - | 12 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | | **26** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | | **26** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | - | 14 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | | **14** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | 5 |
| Кредиторская задолженность | 620 | - | 7 |
| в том числе: | | | |
| перед поставщиками и подрядчиками | 621 | - | 7 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | | **12** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | | **26** |
| Из строки 620: | | | |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | | 7 |

**ОТЧЕТ о прибылях и убытках с 01 января 2011 года по 31 декабря 2011 года**

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Количество прибыльных организаций | 330 | 0 | 0 |
| сумма прибыли | | 0 | 0 |
| Количество убыточных организаций | 340 | 0 | 0 |
| сумма убытка | | 0 | 0 |

**Доля государства в уставном фонде эмитета (всего%)**

| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде,% |
|---|---|---|
| республиканская | 0 | 0 |
| коммунальная | 0 | 0 |

**Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 2 | 2 |
| В том числе: физических лиц | лиц | 2 | 2 |
| Дивиденды,фактически выплаченные на одну акцию(включая налоги) | тысяч рублей | 140,00 | 0,00 |

**Отдельные финансовые результаты**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Среднесписочная численность работающих | человек | 2 | |

- Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета):
Комиссионная торговля
- Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год:
28 марта 2012 г.
- Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета)
Ознакомлены и применяются. Утверждены 12.08.2011

**Руководитель** **А.В. Объяртель**
**Главный бухгалтер** **О.М. Сойко**


## АБЗАЦ

◢ У Магілёўскую вобласць вярнулася зіма — учора тут моцна мяло. За апошнія 3 дні ў вобласці выпала 16-25 мм ападкаў, што складае 138-171% дэкаднай нормы, а месцамі па паўднёвым усходзе — да 30 мм, або 2 дэкадныя нормы.

◢ **Ноччу на пажары ў сваім доме ў Вілейцы загінулі 46-гадовы мужчына і яго 84-гадовая маці. Прычына пажару — перапал электрычнай пліткі. Пра ўзгаранне ў 6 гадзін 19 хвілін па тэлефоне 101 паведаміў сусед. Калі выратавальнікі прыехалі на месца, заўважылі, што індыкатар электрапліткі быў пастаўлены на максімум. Прычынай узгарання падлогі стала няспраўная электраправодка. Гаспадыня дома і яе сын памерлі ад атручэння чадам.**

◢ Кантрабандныя вясельныя строі затрыманы на беларускай мяжы. У пункце пропуску «Макраны» брэсцкія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі мытні спынілі аўтамабіль Citroen, якім кіравала 29-гадовая жыхарка Слуцкага раёна. У асабістых рэчах і пад пярэднім сядзеннем было выяўлена 18 вясельных і 13 вячэрніх сукенак. Папярэдняя сума незадэклараваных тавараў склала амаль Br60 млн. Тавар канфіскаваны супрацоўнікамі мытні.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **У Ніжняй Саксоніі (Германія) кіроўца Ferrari Testarossa на трасе ўбачыў вожыка і, каб не задушыць яго, практычна разбіў сваё дарагое аўто. 53-гадовы Ёрг Дэчар ехаў дадому праз лес, калі ўбачыў жывёлку на дарозе. Імкнучыся аб'ехаць вожыка, ён звярнуў убок і моцна пашкодзіў машыну. Па папярэдняй ацэнцы, рамонт абыдзецца ў $50 тысяч. Як паведамілі паліцэйскія, вожык і кіроўца ў аварыі не пацярпелі.**



***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

